**УДК 811.161.3’342:821.161.3-192Броўка**

## ГУКАВЫ АНАЛІЗ ПЕСЕННА-ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАЎ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ

***Бароўская І. А.***

**Установа адукацыі**
**“Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”**
**г. Гомель, Рэспубліка Беларусь**

***Увозіны***

Вядомы беларускі паэт-лірык, прыкладам высокай паэзіі ў творчасці якога могуць служыць вершы “Пахне чабор”, “Як ліст дубовы…”, “Родныя словы” і многія іншыя. Пятрусь Броўка — сапраўдны майстар грамадзянскай, пейзажнай і інтымнай лірыкі. Мілагучна, кранальна і напеўна гучаць паэтавы радкі. Шчымлівай пяшчотай напоўнены многія вершы П. Броўкі, якія сталі песнямі, таму што праспяваны душой і сэрцамі многіх людзей.

***Мэта***

Вызначыць гукавыя сродкі моўнай выразнасці ў песенна-паэтычных творах Петруся Броўкі.

***Матэрыял і метады даследвання***

Пры нашым даследаванні былі выкарыстаны пошукавы, аналітычны метады, суцэльнай выбаркі.

***Вынікі даследвання і іх абмеркаванне***

З першых сваіх вершаў паэт стварaў тое галоўнае, што потым стане крэдам усёй яго творчасці — адданасць свайму народу, сваёй Беларусі.

Пачынаў паэт сваю творчую дзейнасць яшчэ ў даваенны перыяд: у 1926 годзе выйшаў яго першы верш “Ой, не шапчы, мая бярозка” і з таго часу загаварылі аб новым паэце, у паэзіі якога прысутнічае вобразная маляўнічасць, глыбокая прачуласць. Паэзія гадоў вайны прасякнута заклікамі да барацьбы і помсты. Вядома выказванне Сяргея Грахоўскага, які сказаў, што “вершы Петруся Броўкі ваеннай пары… — гарачая абойма, закладзеная ў снайперскую вінтоўку” [1, с. 78].

У пасляванны час Броўка атрымаў высокія ўзнагароды за свае кнігі, у 1962 годзе урад рэспублікі прысвоіў яму званне народнага паэта БССР. Адным з галоўных матываў паэзіі стаў матыў мірнай працы, паэтызацыя працоўных будней, што натхняла савецкіх людзей да адраджэння гарадоў, вёсак, навукі, культуры, літаратуры. На фоне шчасця мірных дзён паэт стварыў шэдэўры інтымнай лірыкі, сярод якіх, безумоўна, вершы “Пахне чабор”, “Косы”, “Пра вочы”. Па-філасофску мудра чытаецца верш “Калі надыдзе час пачыну”, які уражвае глыбінёй разумення пытанняў дыялектыкі, спрадвечнага імкнення чалавека да шчасця і святла. Неад’емнай часткай паэзіі Броўкі сталі нацыянальныя элементы і фальклорнасць, што робіць яе па-народнаму мудрай.

Якія ж сродкі гукавой інструментоўкі, эўфаніі, гукапісу зрабілі паэзію Броўкі такой музычнай, што некаторыя вершаваныя творы сталі песеннымі? Бліскучыя гукавыя фарбы і эфекты прыцягнулі ўвагу многіх кампазітараў. Гучанне становіцца заўважным, калі паўтараюцца асобныя фанемы, іх спалучэнні (гукавыя паўторы), што падпарадкоўваецца мастацкім задачам для ўзмацнення сэнсавай выразнасці паэтычных радкоў.

Найбольш яскравае вобразнае выяўленне думак і пачуццяў песенна-паэтычным творам надаюць адметныя элементы фанетычнай арганізацыі вершаванай мовы, якія ў спалучэнні з іншымі сродкамі мастацка-эмацыянальнай вобразнасці могуць ствараць яскравую мілагучнасць і выразнасць. Гукавыя паўторы пераўтвараюць мову ў злітнае цэлае і прымушаюць успрымаць іх як своеасаблівую рытмічную метафару [2, с. 156].

Репозиторий ГомГМУ

Адным з важнейшых сродкаў экспрэсівізацыі паэтычнага тэксту лічыцца гукапіс, альбо гукавая інструментоўка, якая ўключае паўтор гукаў як па якасці (алітэрацыя, асананс), так і па месцы (анафара, эпіфара, стык, кальцо). У аснове “гукапісу, яго арганізацыі ў сістэму, амаль заўсёды ляжыць прынцып паўтору, варыяцыі” [3, с. 110].

Самым распаўсюджаным тыпам гукавога паўтору з’яўляецца *алітэрацыя* — сугучнасць зычных гукаў, паўтараэнне аднолькавых або аднародных зычных гукаў, якія ўзмацняюць гукавую і інтанацыйную выразнасць маўлення. Алітэрацыя шыпячых і свісцячых зычных стварае пэўныя асацыяцыі з гукамі прыроды (нагадвае свіст, шоргат, скрып) і ўзмацняецца поруч з лексічнай анафарай: ***Ходзіць*** *восень ў свіце шэрай,* ***З*** *непагодных хмар сатканай. Распусціла ветрыкосы, Над палямі, над барамі,* ***Ходзіць*** *злосная, плюецца, Лісце жоўтае шпурляе… Стане добрай і ласкавай, Заспявае, засмяецца, Світку ўздзене залатую* ***З*** *лісцяў вогненных кляновых…* (“Восень”). Іншым разам алітэрацыя ўзмацняе псіхалагічны эфект перадачы пэўнага настрою — сумнага, задумліва-элегічнага: *Хіба на вечар той можна забыцца? Сонца за борам жар-птушкай садзіцца,* ***Штосьці*** *спявае пяшчотнае бор. Пахне чабор, Пахне чабор… Выйсці б насустрач, стаць і прызнацца. Вось яно — блізкае, яснае шчасце…* (“Пахне чабор”).

Алітэрацыя свісцячых і шыпячых зычных служыць і для перадачы прыўзнятага настрою: *На шляху ты кожным* ***Шчасце*** *сваё стрэнеш. І на кожным будзеш ты расці, Цвёрда і напеўна Ты да мэты прыйдзеш у жыцці…* (“Мая Рэспубліка”).

Пры дапамозе паўтарэння шыпячых і свісцячых Броўка ў вершы “Ой, не шапчы, мая бярозка” перадае адзін з прыгожых малюнкаў прыроды — шапаценне лістоты бярозы, якая нібы размаўляе з паэтам, што стварае сумны, нават мінорны настрой верша: *Ой, не шапчы, мая бярозка, журлівым пошаптам галінаў, Пайду сягоння ў поле позна – Сустрэну любую дзяўчыну… Дык не шапчы, мая бярозка, Ў ліпнёвы вечар мне не сумна — Вітаю свету новы росквіт І Беларусь, маю красуню!*

Санорны, дрыжачы гук [р] пры алітэрацыі ўжываецца для перадачы выразных або рэзкіх гукаў грукату, грому. У вершы “На Палессі гоман” адлюстраваны працэс асушвання балот, перыяд так званай меліярацыі: *Разгудзелася балота, Зашумелі чараціны, Узяліся за работу Экскаватары, машыны. Гул нястрыманы, бясконцы, Трактары за трактарамі, Скібы тлустыя пад сонцам Рассцілаюцца радамі. Хто рыдлёўкай маша ўдала, Хто карчы з-пад багны рые… Роўна ложацца каналы, Быццам стужкі люстраныя…*

Калі поруч з гукам [р] ужываецца [г] і санорныя ў спалучэнні з галоснымі [ма] [мо], ствараецца малюнак рэзкіх грукатаў, раскату грома, як у вершы “Гром”: *Люблю, калі прастор кругом Ускалыхне магутны гром, Разбудзіць дол Дажджом вакол, Руччамі-срэбрам прашуміць, і пойдуць Травы гаманіць… Грымяць грымоты гнеўна й там, Дзе горны грамае…*

Прырода выбухных ў гукапісе адыгрывае сваю ролю, так, напрыклад, паўторы [б]-[п], [д]-[т], [к]-[ц] перадаюць рытмічныя, хуткаплынныя або рэзкія гукі, ці паказваюць дынаміку дзеяння, імклівасць руху, рэзкую змену падзей: *Ён ішоў пад бізунамі, Па чатыры ў рад — Закаваны кайданамі Баявы атрад. Перамучаныя ногі Па пяску брылі… Над апошняю дарогай Хмары слёз плылі. Партызанам кусцік кожны Пеў пра тыя дні, Як па гэтай па дарозе Бегалі паны…* (“Дукорскія партызаны”).

Інтанацыйную выразнасць, мілагучнасць, пэўную меладычнасць стварае ў радку *асананс* — сугучнасць, паўторы галосных. Найчасцей асануюцца гукі [а], [і], [ы], [у]: *…Ён ішоў пад бізунамі, па чатыры ў рад — закаваны кайданамі Баявы атрад* (“Дукорскія партызаны”); *Кукавала зязюленька ў Рыгоравай хаце, Кукавала, кукавала, кінула дзіцяцю, Бо казала, што з Рыгорам ёй жыццё не міла. Болей я ўжо не запомніў, да каго хадзіла…* (“Зязюленька”).

Репозиторий ГГПУ

Узмацненню эмацыянальнага паэтычнага выказвання, узвышэнню яго тону, кампазіцыйнай арганізацыі, аб'яднанню асобных радкоў садзейнічае анафара. Гэты прыём заключаецца ў паўтарэнні аднолькавых гукаспалучэнняў, слоў ці выразаў у пачатку вершаваных радкоў або суседніх строфаў. У паэзіі П. Броўкі найчасцей заўважаны лексічныя і сінтаксічныя анафары: ***Зоры*** *над садамі вісцуць,* ***Зоры*** *над сталіцамі бруяць…* ("Мая рэспубліка"); ***Хто*** *рыдлёўкай маша ўдала,* ***Хто*** *карчы з-пад багны рые…* ("На Палессі гоман"); … *Год адзінаццаць, а можа, дванаццаць* ***Сэрца*** *баліць, што не здолеў спаткацца,* ***Сэрца*** *нязменна хвалюе дакор…* ("Пахне чабор").

*Ой,* ***не шапчы, мая бярозка****,*
*Журлівым пошаптам галінаў,*
*Пайду сягоння ў поле позна –*
*Сустрэну любую дзяўчыну…*
*Дык* ***не шапчы, мая бярозка****,*
*Ў ліпнёвы вечар мне не сумна –*
*Вітаю свету новы росквіт,*
*І Беларусь, маю красуню* ("Ой, не шапчы, мая бярозка").

Калі ў канцы вершаваных радкоў ці строфаў паўтараюцца аднолькавыя гукі, словы ці выразы, мы гаворым пра такі прыём, як *эпіфара.* У якасці ясравых прыкладаў строфнай эпіфары (калі асобныя словы ці выразы паўтараюцца ў канцы асобных строфаў) прывядзем урыўкі з верша "Пахне чабор":

*Хіба на вечар той можна забыцца?*
*Сонца за борам жар-птушкай садзіцца,*
*Штосьці спявае пяшчотнае бор.*
***Пахне чабор,***
***Пахне чабор…***
*Лёгкія крокі на вузкай сцяжынцы,*
*Дзеўчына ў белай іскрыстай хусцінцы,*
*Быццам абсыпана промнямі зор.*
***Пахне чабор,***
***Пахне чабор…***

***Заключэнне.***

Такім чынам, нават невялікае даследаванне гукавых сродкаў моўнай выразнасці ў паэтычных творах П. Броўкі дазваляе сцвярджаць, што багатыя сродкі фонікі надзвычай узмацняюць інтанацыйна-рытмічную выразнасць тэксту. Выкарыстанне аўтарам гукавых сродкаў апраўдваецца мастацкай патрэбай і мэтазгоднасцю зместу.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Іменем чалавечнасці: зб. крытыч. артыкулаў: Кн. для вучняў / К. І. Краўцова. — 2-е выд., перапрац. і дап. — Мінск: Нар. асвета, 1986. — 207 с.
2. *Тынянов, Ю. Н.* Проблемы стихотворного языка: статьи./ Ю. Н. Тынянов. — М.: Сов. писатель, 1965. — 304 с.
3. *Журайлёў, В. П.* Пытанні паэтыкі / В. П. Жураўлёў, І. С. Шпакоўскі, А. С. Яскевіч — Мінск: Навука і тэхніка, 1974. — 220 с.

**УДК 811.161.1'243:82**

## ОСНОВНЫЕ МЕТОДЫ РАБОТЫ НАД ХУДОЖЕСТВЕННЫМ ТЕКСТОМ В РАМКАХ ПРАКТИЧЕСКОГО КУРСА РКИ

***Берёзко Н. В.***

**Учреждение образования**
**«Гомельский государственный медицинский университет»**
**г. Гомель, Республика Беларусь**

***Введение***

В современной практике преподавания русского языка как иностранного значительная роль отводится художественной литературе. Применение художе-



Репозиторий ГомГМУ